*УДК 61:615.1(062)(476-25)*
*ББК 52я73*
*А 43*
*ISBN 978-985-21-1258-1*



***Жамайтук А.В.***

# АБ ФАРМІРАВАННІ ЛІНГВАПРАГМАТЫЧНЫХ УМЕННЯЎ БУДУЧАГА ЎРАЧА Ў ТЭОРЫІ І ПРАКТЫЦЫ МЕДЫЦЫНСКАЙ АДУКАЦЫІ

***Навуковы кіраўнік: ст. выкл. Носік А.А.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

**Актуальнасць.** Бесперапынныя змены ў сучасным грамадстве, звязаныя з дасягненнямі навукі і тэхнікі і імклівым развіццём медыцыны ствараюць новую сітуацыю, у якой узрастае значнасць чалавечага фактару ў лячэбным працэсе. Штодзённае жыццё і практыка вылучаюць на першы план значэнне асобы ўрача і важнасць пабудовы ўзаемаадносін паміж урачом і пацыентам. Па гэтай прычыне аптымізацыя працэсаў эмацыянальнага ўзаемадзеяння ў медыцынскай сферы зносін, а, такім чынам, і сацыяльна-псіхалагічнай падрыхтоўкі лекара стаіць цяпер даволі востра.

**Мэта:** прааналізаваць крыніцы і фактары, якія фарміруюць лінгвапрагматычныя навыкі ўрача; вызначыць асноўныя ўменні, якія ўтвараюць камунікатыўную кампетэнцыю ўрача.

**Матэрыялы і метады**. На падставе адабраных навуковых крыніц была атрымана інфармацыя аб фактарах, якія аказваюць уплыў на фарміраванняе камунікатыўнай кампетэнцыі будучага ўрача. На прыкладзе адпаведных дысцыплін, якія выкладаюцца ва ўніверсітэце, праведзены аналіз развіцця лінгвапрагматычных уменняў студэнтаў як будучых медыцынскіх работнікаў.

У аснову дзейнасці ўрача пакладзены асобасна-арыентаваны падыход, пры рэалізацыі якога значная роля належыць асобе самога спецыяліста. Адпаведна, працэс авалодання прафесійнымі ўменнямі і навыкамі прадугледжвае выпрацоўку яшчэ і псіхалагічных уменняў, накіраваных на вырашэнне камунікатыўных сітуацыйных задач рознай складанасці. У выніку сфарміраваная здольнасць ацэньваць псіхалагічны стан пацыента выступае адным з важных кампанентаў для ўсталявання партнёрскіх адносін у дасягненні агульнай мэты.

**Вынікі:** камунікатыўная кампетэнцыя ўяўляе сабой адзін з важных складнікаў прафесійнай кампетэнцыі, якую неабходна ўдасканальваць у працэсе падрыхтоўкі ўрачоў. Лінгвапрагматычныя ўменні часта маюць вырашальнае значэнне ў пытаннях задаволенасці пацыента, уплываюць на паўнату і дакладнасць дыягностыкі, а таксама эфектыўнасць функцыянавання сістэмы аховы здароўя ў цэлым.